# АДУКАЦЫЙНАЯ МАДЭЛЬ У ТВОРЧАСЦІ Д. АНДРЭЕВА

*У. Л. Аляксандраў*

Шматгранная творчасць мысляра і паэта Данііла Андрэева сваёй арганічнай часткай мае мадэль адукацыі, якая, па яго перакананні, будзе запатрабаваная ў новых сацыяльных і культурных умовах. Выкладзеная больш за паўстагоддзі таму на старонках яго галоўнай працы «Ружа свету» , а таксама ў паэтычных творах і ліставанні, гэта мадэль ужо знайшла сваё фактычнае ўвасабленне ў педагагічнай практыцы многіх краін, прытым што тэарэтычнае абгрунтаванне гэтых навацый абапіраецца на самыя розныя філасофскія, рэлігійныя, культурныя крыніцы.

Асновы педагагічнай сістэмы самога Д. Андрэева вынікалі з яго агульных светапоглядных прынцыпаў: 1) неабходнасці негвалтоўнага суіснавання розных культур і народаў у межах непазбежнай глабалізацыі (сучасныя праблемы мультыкультуралізму і талерантнасці); 2) магчымасці фарміравання асобы, якая, рэалізуючы свае здольнасці ў пэўнай галіне, здольная да пладатворнага сінтэзу як унутры адпаведнай сферы грамадства (мастацтва, рэлігія, навука, палітыка, эканоміка), так і на скрыжаванні гэтых сфер; 3) магчымасці дыялектычнага вырашэння вядомых бінарных апазіцый жыцця чалавека: асабістае/грамадскае, нацыянальнае/агульначалавечае, свецкае/царкоўнае, матэрыяльнае/духоўнае і інш.

Працы Д. Андрэева, цудам створаныя ва ўмовах турэмнага заключэння і цудам ацалелыя, не маглі быць надрукаваныя пры яго жыцці і знайшлі сваіх чытачоў толькі напрыканцы існавання СССР. Але адразу яны атрымалі шэраг ярлыкоў («эзатэрыка», «тэасофія», «містыка»), якія перашкодзілі іх сур’ёзнаму навуковаму і філасофскаму аналізу. І хаця за апошнія два дзесяцігоддзі былі абароненыя больш за дзесятак дысертацый адносна яго творчасці, прычым у розных галінах – філалогіі, культуралогіі, паліталогіі, філасофіі (навуковыя працы Дз. К. Ахтырскага, І. В. Чындзіна, В. А. Дашэўскай, А. П. Рашчэўскай, А. М. Гібралтарскай, С. У. Кручыніна, Т. І. Шуран, А. В. Арловай, Т. В. Мельнікавай, Е. У. Часаўскіх і інш.), імя Д. Андрэева застаецца несправядліва маргіналізаваным. Несправядлівасць такой ацэнкі можна давесці рознымі спосабамі. Адзін з іх – пералік прагнозаў з розных сфераў жыцця, якія ўжо спраўдзіліся, прычым многія з іх на той момант – 50-я гады XX стагоддзя – здаваліся неверагоднымі і не сустракаліся практычна нідзе (напрыклад, у палітычнай сферы – прагноз распаду сацыялістычнага лагера [2, с. 236] і нават Савецкага Саюза [1, с. 229], аб’яднання ўсёй Еўропы [1, с. 261]; у квантавай фізіцы – прадбачанне дзялімасці пратона [1, с. 270], пры тым што гіпотэза кваркаў была высунута пасля яго смерці ў 1964 годзе; у астраноміі – прадбачанне паняцця «антыматэрыі» (названай фізікамі «цёмнай») [2, с. 44] якая складае большую частку«нябачнай» масы Сусвету, адкрыта й 1970-я гады астраномам Верай Рубін).

Некаторыя з тых прагнозаў, якія можна лічыць ужо часткова ці цалкам спраўджанымі, тычацца менававіта сферы адукацыі. Гэта адносіцца, па-

першае, да арганізацыйных і метадычных аспектаў навучання і выхавання: павелічэнне працягласці навучання ў сярэдняй школе; увядзенне трох паглыбленых ухілаў – гуманітарнага, прыродазнаўчага і тэхнічнага – у старэйшых класах; выкарыстанне, як іх зараз называюць, мультымедыйных і іншых інавацыйных сродкаў, а таксама метадаў унутранай псіхалагічнай працы (медытацыі і інш.); глабалізацыя як спалучэнне транснацыянальных стандартаў з нацыянальна-культурным зместам; практыкаарыентаванасць і кампетэнтнасны падыход (паводле якога галоўнае – не веды як самамэта, а ўменні – жыць, працаваць, адпачываць, ствараць, мець зносіны); індывідуальны падыход; нефармальная і дадатковая адукацыя; міждысцыплінарнасць і шырокая агульнакультурная падрыхтоўка ў спалучэнні з глыбокімі прафесіянальнымі ведамі; гадавое навучанне студэнтаў у іншых краінах; стварэнне моладзева-турыстычных агенстваў, дзяржаўных і недзяржаўных фондаў для арганізацыі падарожжаў з адукацыйнымі мэтамі і дзеля культурнага абмену [2, с. 240, 244, 245]. Сфармуляваныя ў сталінскіх засценках, у часы «жалезнай заслоны» і амаль поўнай закрытасці краіны, гэтыя мары маглі лічыцца адарванымі ад жыцця фантазіямі альбо трызненнем. У частцы зместу адукацыі адбылося ўвядзенне экалагічнага навучання і выхавання (найперш у еўрапейскіх краінах і ў некаторых краінах Азіі), адкрыццё такіх дысцыплін і спецыяльнасцяў , як «рэлігіязнаўства», «гісторыя рэлігій», «культуралогія», «мастацкая культура» (замест пануючых у той час «навуковага атэізму» і «навуковага камунізму») [2, с. 246].

Антрапалагічным падмуркам адукацыйнай мадэлі Д. Андрэева з’яўляецца вобраз чалавека, рысы якога можна знайсці ў розных філасофскіх і педагагічных сістэмах, у ідэалах розных эпох. Адно з яго любімых паняццяў – сінтэз – можа быць ужыта да апісання такой асобы. Паводле Д. Андрэева, інтэлектуальнае аблічча «чалавека авысакароджанага вобразу» характарызуецца бесперапынна пашыраемай эрудыцыяй (як зараз кажуць, «адукацыя праз усё жыццё»), самастойнасцю і незалежнасцю («крытычнасцю») мыслення; эстэтычнае аблічча характарызуецца глыбокай патрэбнасцю мастацкіх уражанняў і патрэбнасцю ва ўласнай, няхай і сціплай, мастацкай творчасці, шырокімі ведамі ў галіне культуры; маральнае аблічча – дзейнаснай, актыўнай, але не паказной дабрынёй, пачуццём спагады, спачування (узгадаем шырокі распаўсюд зараз дабрачынных, валанцёрскіх арганізацый, гуманітарных праектаў); рэлігійнае аблічча характарызуецца шырокай верацярпімасцю, адсутнасцю фанатызму, дагматызму, здольнасцю са-вераваць пры захаванні сваёй канфесіянальнай ідэнтычнасці, унутранай патрэбнасцю ў рэлігійнай творчасці і ў працы над раскрыццём органаў духоўнага ўспрымання рэчаіснасці [2, с. 242].

Часткова гэты вобраз чалавека карэлюе з антрапалагічнымі ідэаламі эпохі Адраджэння і эпохі Асветніцтва. Але пасля трагедый XX стагоддзя, сусветных войнаў і масавых рэпрэсій таталітарных рэжымаў, любыя спробы зноў будаваць утапічныя мадэлі чалавека і грамадства сустракаюць справядлівую насцярожанасць, скепсіс, іронію. Д. Андрэеў, сам стаўшы адной з ахвяраў камуністычнага эксперыменту і адносячыся да савецкай улады з неверагоднай

для таго часу бескампраміснасцю (маючы 25-гадовы тэрмін зняволення, ён, ужо цяжка хворы, адмовіўся пісаць прашэнне аб памілаванні), не мог не бачыць гэтых асацыяцый. Аднак яго вера ў чалавека, грунтаваная на ўласным духоўным досведзе (выражаным лейбніцаўскім паняццем «манада» у значэнні – «найвышэйшае несмяротнае богастворанае Я»), была непахіснай.

Ёсць у канцэпцыі Д. Андрэева тэма, якая істотна адрознівае яго педагагічныя погляды ад амаль усіх сістэм папярэдніх часоў. Размова пра яго погляды на прыроду, якія можна было б назваць унікальнымі, калі не ўлічваць, што яны ў значнай ступені былі ўласцівыя для чалавецтва старажытных эпох, а для ўсходніх культур – і ў пазнейшыя часы. Гэта нават не погляды, а глыбокае асабістае адчуванне, перажыванне, усведамленне прыроды як жывой рэчаіснасці, да якой можна і трэба ставіцца з чалавечымі пачуццямі любові, сяброўства, спагады, спачування, сурадавання. На старонках «Ружы свету», у сваіх вершах і паэмах Д. Андрэеў неаднаразова звяртаецца да гэтай тэмы. Як мысляр ён вылучае 4 фазы ў гісторыі эвалюцыі стасункаў чалавека і прыроды: на першай «чалавек не ўсведамляе прыроду як нешта , што знаходзіцца па-за ім і не супрацьпастаўляе сябе ёй» [2, с. 37]. Другую стадыю ён называе «прыродаборчай», лічачы, што карані яе – не ў навуцы, а ў монатэістычных рэлігіях, якія альбо ігнаравалі прыроду, альбо былі ёй варожыя. Гэта прыродаборчая тэндэнцыя «знішчыла прыродныя культы германскага і славянскага паганства і панавала да канца сярэднявечча» [2, с. 37]. Для трэцяй фазы «прырода ёсць аб’ект разумовага (навуковага) даследвання» і «сонмішча бяздушных сіл, якія трэба скарыць на патрэбы чалавека» [2, с. 37]. Арыгінальным з’яўляецца сцверджанне Д. Андрэева, што «найбольшага супрацьпастаўлення сябе прыродзе чалавецтва дасягнула не ў ХХ стагоддзі, як гэта магло б здавацца, а ў XVII, XVIII і напачатку ХІХ стагоддзя» [2, с. 37]. Прычыну гэтага ён бачыць у крайнасцях хрысціянскага аскетызму, на змену якому прыйшоў снабізм навуковай, рацыяналістычнай эпохі. Чацвёртая стадыя, якую Д. Андрэеў называе інстынктыўна-фізіялагічнай, характарызуецца абуджэннем нейкага смутку, тугі па прыродзе (выкліканых наступствамі ўрбанізацыі, механізацыі, тэхнізацыі жыцця) і якая праяўляецца ў паэзіі і жывапісу пэўных кірункаў , развіцці спорту, турызму, пляжнага адпачынку, эвалюцыі моды ў бок адкрытасці і лёгкасці [2, с. 38]. Пры гэтым Д. Андрэеў прагназуе надыход наступнай стадыі, на якой «магчыма і неабходна, захоўваючы старыя адценні любові да прыроды, за выключэннем, канечне, амаральна-утылітарнага стаўлення да яе, бязмежна ўзбагаціць гэта стаўленне сэнсам этычным і рэлігійным» [2, с. 38]. Ён падкрэслівае, што гаворка ідзе не пра агульнапантэістычнае пачуццё «еднасці з прыродай» ці «замілаванне яе прыгажосцю», а пра стаўленне, «заснаванае на досведзе перажывання шматлікіх стыхій прыроды і зносінах з імі на ўзроўні любові, сяброўства, сумеснай творчасці» [2, с. 39]. Асаблівую значнасць ён, падобна Альберту Швейцару, надае неабходнасці пабудовы этычных стасункаў з жывёльным светам, прадбачыўшы ўзнікненне адпаведных грамадскіх рухаў і арганізацый. Вядома, для людзей як артадаксальна рэлігійных , так і навукова-матэрыялістычных поглядаў, дзіўна ці дзіка гучыць сцверджанне пра

адухоўленасць і нават разумнасць кветак і рэк, гор і дрэваў. Д. Андрэеў насуперак гэтаму скепсісу ці абурэнню перакананы, што ў падмурку старажытных вераванняў, якія пазней пагардліва назвалі паганствам, ляжаць пэўныя ісціны, колькі б скажэнняў і прымітывізму ў іх не ўтрымлівалася (антрапамарфізм, ахвярапрынашэнні і да т. п.). Як лічыць Д. Андрэеў, новае «стаўленне да прыроды спалучае паганскую жыццярадаснасць, монатэістычную адухоўленасць і шырокасць ведаў навуковай эры, усе гэтыя элементы ператвараючы ў вышэйшае адзінства ўласным духоўным досведам» [2, с. 39]. Гэтымі мэтамі і будзе на яго думку вызначацца экалагічнае выхаванне і навучанне.

### Літаратура і крыніцы


1. Андреев, Д. Л. Железная мистерия : Поэма / Д. Л. Андреев. – М.: Молодая гвардия, 1990. – 315 с.
2. Андреев, Д. Л. Роза мира. Метафилософия истории / Д. Л. Андреев. – М.: Прометей, 1991. – 288 с.